# ПАДПОЛЬНАЯ ГРУПА
# З. Ф. КОЧАТАВАЙ

**Перыяд дзеяння:**

лета 1942 г. – кастрычнік 1943 г.

**Месца дзеяння:**

в. Батрукі і г. Віцебск

**Колькасць:**

6 чалавек

**Кіраўнікі:**

Кочатава Зінаіда

Дзейнічала ў Віцебску і ў в. Батрукі з лета 1942 г. да кастрычніка 1943 г. Кіраўнік З. Ф. Кочатава. У групу з 6 чалавек уваходзілі яе муж М. В. Кочатаў, сястра Г. Ф. Лятоха (Дворнікава), Е. С. Круглікаў і яго жонка А. С. Пранеўская, Я. А. Вількові.

Падпольшчыкі ратавалі савецкіх ваеннапалонных, перапраўлялі іх у партызанскія атрады. У чэрвені 1943 г. наладзілі пабег дэшыфравальшчыку нямецкай вайсковай часці чэху Іагану Лойдзе, які займаўся ў разведштабе расшыфроўкай радыёграм Чырвонай арміі і партызанскіх брыгад. Лойда быў перапраўлены ў 1-ю Беларускую партызанскую брыгаду, адтуль – у Маскву, дзе паведаміў каштоўныя звесткі пра характар, колькасць і месцы дыслакацыі вайсковых часцей у Віцебску, пра сістэму гітлераўскай радыёразведкі, а, галоўнае, пра недахопы ў зашыфроўцы партызанскіх радыёграм. Пасля вайны Лойда наведваў Віцебск, а Галіна Лятоха неаднойчы гасцявала ў «Івана Іванавіча», як ён сам сябе называў.

У кастрычніку 1943 г. З. Ф. Кочатава, тры яе сястры, Вількові былі арыштаваны, потым іх чакалі катаванні і адпраўка ў фашысцкі канцлагер Асвенцым, дзе Зінаіда Філатаўна і загінула.

Пазбеглі арышту, пайшлі ў партызанскі атрад, а потым на фронт – Кочатаў, Круглікаў і Пранеўская. Чацвёра членаў групы ўзнагароджаны.

**ЛІТАРАТУРА**

1. **Дарафеенка, Н. І.** Падпольная група З. Ф. Кочатавай / Н. І. Дарафеенка // Памяць: Віцебск : гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі : у 2 кн. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.] ; склад. А. І. Мацяюн ; маст. Э. Э. Жакевіч. – Мінск, 2002. – Кн. 1. – С. 487–488.

2. **Подпольная** группа Кочетовой З. Ф. // Витебск : энцикл. справочник / редкол.: И. П. Шамякин (гл. ред.) [и др.]. – Минск, 1988. – С. 288–289.